ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (812) ● Чацвер, 6 мая 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## НАШ КАНДЫДАТ

У актавай зале галоўнага корпуса універсітэта з вялікім уздымам прайшоў сход прафесарска-выкладчыцкага саставу, аспірантаў і студэнтаў, рабочых і служачых універсітэта, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. Адкрыў яго прарэктар БДУ прафесар А. Я. Малышаў. Ён прадастаўляе слова сакратару паркома дацэнту М. К. Гарбачову, які прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Галадзедаўскай выбарчай акрузе члена КПСС з 1932 года, члена ЦК КПБ, рэктара універсітэта акадэміка Антона Нічыпаравіча Сеўчанку. М. К. Гарбачоў грунтоўна ахарактарызаваў жыццёвы і навуковы шлях Антона Нічыпаравіча — вядомага вучонага, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча.

Аб клопатах, якія праяўляе Антон Нічыпаравіч аб развіцці навукі, росце універсітэта, падрыхтоўцы навуковых кадраў, аб яго бацькоўскіх клопатах аб супрацоўніках, аспірантах і студэнтах гаварылі ў сваіх выступленнях дацэнт фізфака А. В. Шыбаева, прафесар, доктар філалагічных навук І. Я. Навуменка, студэнтка гістарычнага факультэта В. Гаргоц. Яны падтрымалі прапанову М. К. Гарбачова аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР акадэміка А. Н. Сеўчанкі. Сход аднадушна прыняў гэтую прапанову.

Затым выступіў начальнік вучэбнай часткі універсітэта В. С. Далгарукаў з прапановай аб вылучэнні прадстаўнікоў ад універсітэта на акруговую перадвыбарную нараду. Сход аднадушна падтрымаў гэтую прапанову і вылучыў вялікую групу сваіх прадстаўнікоў на акруговую перадвыбарную нараду.

НАШ КАР.

## СВЯТА ЖУРНАЛІСТАЎ

Учора, 5 мая, на факультэце журналістыкі асаблівая ўрачыстасць адчувалася ва ўсім: і ў святочным настроі выкладчыкаў і ў вясёлым шматгалоссі студэнтаў — будучых работнікаў газет, радыё і тэлебачання. І гэта зразумела: 5 мая — Дзень друку, свята журналістаў.

Па даўняй традыцыі ў гэты дзень факультэт прымаў дарагіх гасцей—выпускнікоў розных гадоў, цяпер вядомых журналістаў, рэдактараў рэспубліканскіх і раённых газет, пісьменнікаў і паэтаў Беларусі.

Госці выступілі перад маладымі журналістамі з успамінамі аб мінулым факультэта, расказалі аб працоўных буднях рэдакцый.

М. КАШАРОЎСКІ.





● ПРАБЛЕМЫ ● РОЗДУМ ● ВОПЫТ

## МАТЭМАТЫКА— СТУДЭНТАМ-ФІЗІКАМ

На фізфаку матэматыка належыць да ліку фундаментальных дысцыплін, а матэматычныя курсы займаюць значную частку вучэбнага плана. І гэта зразумела. Вывучэнне і засваенне розных навук, якія складаюць сучасную фізіку, заснавана на шырокім выкарыстанні матэматыкі. Важнай з'яўляецца і выхаваўчая роля матэматыкі, бо менавіта яна вучыць разважаць строга і вынаходліва, улічваць усе бакі даследуемых з'яў, раскрываць глыбінныя сувязі паміж рознымі працэсамі.

Фізіка і матэматыка заўсёды былі цесна звязаны паміж сабой, а цяпер, у эпоху матэматызацыі ўсёй навукі, гэтая сувязь развіваецца асабліва бурна.

Напружаная матэматычная работа пачынаецца адразу ж, у першыя дні заняткаў студэнта - першакурсніка. Спецыфіка факультэта патрабуе хуткага авалодання найбольш эфектыўнымі метадамі матэматычнага даследавання. Гэта прыводзіць да ўшчыльнення вучэбнага матэрыялу, да насычэння яго разнастайнымі глыбокімі ідэямі. У такіх абставінах многае залежыць ад ступені матэматычнай падрыхтоўкі нашых навічкоў, ад іх здольнасці прынаравіцца да запатрабаванняў нашага цяжкага факультэта, ад характару ўзаемаадносін у кожнай акадэмічнай групе.

На факультэт паступае многа здольных, захопленых, працавітых юнакоў і дзяўчат. Некаторыя з іх у школе або шляхам самаадукацыі атрымалі паглыбленую матэматычную падрыхтоўку. Наша задача, гаворачы спартыўнай мовай, — падтрымаць іх у добрай форме. Дабівацца гэтага трэба рознымі спосабамі, якія карысна дапаўняюць адзін аднаго. Перш за ўсё, першакурснікі з добрай падрыхтоўкай могуць прынесці вялікую карысць, калі будуць займацца з патэнцыяльна моцнымі, але менш падрыхтаванымі таварышамі. Падкрэсліваю, тут гутарка ідзе не аб дапамозе слабым, а аб сумеснай рабоце. Такая дапамога слабейшым прыносіць узаемную карысць (дзелячыся ведамі, заўсёды ўзбагачаешся), вядзе да ўстанаўлення ў групе і на патоку па-сапраўднаму рабочых абставін.

Не меншае значэнне мае і індывідуальная работа нашых студэнтаў. Універсітэты, як ні адна іншая навучальная ўстанова, заўсёды садзейнічалі раскрыццю індывідуальных магчымасцей сваіх выхаванцаў. Кожны наш выкладчык лічыць важнейшым абавязкам кіраўніцтва дапытлівымі студэнтамі, якія імкнуцца пашырыць або паглыбіць свае матэматычныя заняткі.

На нашай кафедры распрацаван план мерапрыемстваў, якія павінны садзейнічаць развіццю сувязей з кожным зацікаўленым студэнтам. Тут і індывідуальныя кансультацыі, і спіс дадатковай вучэбнай літаратуры з канкрэтнымі ўказаннямі асабліва важных раздзелаў, і падборка задач павышанай цяжкасці. Ёсць мерапрыемствы, якія будуць праведзены кафедрай сумесна з СНТ факультэта. Першае з іх ужо па-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## НАТХНЯЕ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

У нас, пяцікурснікаў, нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е сёлетняй вясны, цяпер самая гарачая пара. Мы працуем над дыпломнымі работамі. Зразумела, што справа гэта не з лёгкіх. Але калі цябе натхняе жывая зацікаўленасць да выбранай тэмы, да таго, над чым працуеш, ад такой працы атрымліваеш задавальненне.

Тэма маёй дыпломнай нарадзілася два гады назад. Я ведала, што ў апошні час на Палессі даследуецца ўздзеянне меліярацыі на мікраклімат асушаных тарфянікаў. Работай кіруе Беларускі гідрамеліярацыйны цэнтр і Мінская абсерваторыя. А ў раёне Васілевіч Гомельскай вобласці Рэчыцкага раёна вывучэннем мікраклімату асушаных тарфянікаў займаецца кафедра фізічнай геаграфіі СССР БДУ пад кіраўніцтвам прафесара А. Х. Шкляра. У час летняй практыкі на III і IV курсах я разам з іншымі нашымі студэнтамі працавала па гэтай тэме, даследавала ўздзеянне меліярацыі на тэмпературны рэжым і вільготнасць глебы і паветра.

Рашэнне пастаўленай праблемы мае вялікае практычнае значэнне. І ў той жа час вабіць сам працэс палявых даследаванняў. Работа вельмі захапіла мяне. Матэрыялы даследаванняў ляглі ў аснову курсавой, а потым і дыпломнай работы. Тэма яе «Тэмпература глебы і паветра асушаных тарфянікаў».

Аналіз даных, атрыманых у перыяд палявых назіранняў, даў магчымасць зрабіць вывады аб залежнасці тэмпературнага рэжыму глебы і паветра ад ступені асушанасці тэрыторыі і аб уздзеянні змянення мікраклімату на сельскагаспадарчыя культуры — пшаніцу, бульбу, травы, аб параўнаўчай марозастойкасці палёў у веснавы і асенні перыяды, аб цеплазабяспечанасці глебы. Значную дапамогу пры апрацоўцы атрыманых матэрыялаў аказаў кіраўнік маёй дыпломнай прафесар А. Х. Шкляр. Ён дае шмат карысных парад, арыентуе пры выбары дадатковай літаратуры па кліматалогіі, глебазнаўству, геаграфіі,

Дыпломную дапаўняюць шматлікія карты марозабяспечнасці, цеплазабяспечанасці глебаў. Тэарэтычныя вывады праілюстраваны графікамі, табліцамі. Нагляднае ўяўленне аб методыцы мікракліматычных даследаванняў даюць шматлікія фотаздымкі.

Н. АСОЦКАЯ,
студэнтка V курса геафака.

НА ЗДЫМКУ: адна са старэйшых выкладчыкаў дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Алена Паўлаўна ЕРАСЬ праводзіць кансультацыю па курсавой рабоце са студэнтам І курса аддзялення філасофіі Аляксандрам ВАСІЛЁНКАМ.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



# Рашэнні XXIV з'езда — у жыццё

«Партыя па праву ганарыцца маладымі будаўнікамі камунізма. Наш абавязак—перадаваць новым пакаленням свой палітычны вопыт, вопыт вырашэння праблем эканамічнага і культурнага будаўніцтва, кіраваць ідэйным выхаваннем моладзі, рабіць усё, каб яна дастойна працягвала справу сваіх бацькоў, справу вялікага Леніна».

(З даклада Л. І. Брэжнева на XXIV з'ездзе КПСС).

# МАТЭМАТЫКА — СТУДЭНТАМ-ФІЗІКАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

чалося. Гэта цыкл факультатыўных лекцый, прысвечаных пазапраграмным матэматычным пытанням, якія адыгрываюць вялікую ролю ў некаторых раздзелах сучаснага прыродазнаўства. Усе гэтыя захады разлічаны на нашых вучняў, якія разабраліся ў абставінах на факультэце, трывала сталі на ногі, паверылі ў сябе, ды і праявілі сябе. Іх многа. Аднак не толькі яны ўваходзяць у наш студэнцкі калектыў.

Параўнальна невялікая частка паступіўшых аказваецца на фізфаку па непаразуменні, не разабраўшыся ў асабістых здольнасцях і магчымасцях, па недагляду прыёмнай камісіі. Памылка выяўляецца звычайна ў першыя месяцы заняткаў. Нялёгкі абавязак выяўлення такіх памылак у значнай ступені лажыцца на плечы выкладчыкаў матэматыкі.

Немалую долю слаба паспяваючых і нават непаспяваючых складаюць, аднак, студэнты другой катэгорыі. Яны могуць, хочуць і будуць вучыцца на фізфаку, нягледзячы на няўдачны старт або, што бывае больш рэдка, на няўдачы ў тым ці іншым семестры. За выпраўленне становішча кожнага такога студэнта мы абавязаны змагацца ўсімі сіламі.

Якія ж звычайна прычыны адставання па матэматыцы? Што мы робім для паляпшэння паспяховасці?

Матэматыка вызначаецца стройнасцю, абстрактнасцю. Яе выкладанню заўсёды ўласціва пераемнасць. Матэматыка вну—прадаўжэнне школьнай. Універсітэцкі курс штодзённа выкарыстоўвае і істотна абапіраецца на факты элементарнай матэматыкі. Недахопы матэматычнай падрыхтоўкі не ліквідуюцца самі па сабе, яны патрабуюць ліквідавання з дапамогай самастойных дадатковых заняткаў. Засваенне вышэйшай матэматыкі магчыма толькі пры сістэматычнай працы над ёй. Выкладчыкі матэматыкі строга кантралююць рэгулярнасць студэнцкіх заняткаў, таму што недастатковае засваенне адной з тэм практычна выключае разуменне наступных. Сувязь заняткаў забяспечваецца падрабязнымі ўзаемаўзгодненымі рабочымі планамі розных лекцыйных курсаў і практычных заняткаў.

Вялікае значэнне для студэнтаў мае і авалоданне своеасаблівай матэматычнай мовай, дакладнай і строгай. Студэнт павінен навучыцца выказвацца матэматычна. Для гэтага трэба практыкавацца, гаварыць на матэматычныя тэмы з таварышамі, выпраўляць адзін у другога няправільныя словазлучэнні, прасіць выкладчыка зноў і зноў тлумачыць незразумелыя выразы.

Студэнт павінен памятаць, што калі ён, пашукаўшы, не знайшоў адказу на якое-небудзь пытанне, то гэтае пытанне не можа аказацца «неразумным» з пункту гледжання выкладчыка. Самае непрыемнае для выкладчыка — пасіўнасць аўдыторыі, яе маўчанне.

На кожнаму курсу выкладчык рэкамендуе некалькі падручнікаў. Трэба азнаёміцца з гэтымі падручнікамі і выбраць сярод іх «свой», г. зн. такі універсітэцкі падручнік, які ўлічвае асаблівасці падрыхтоўкі і сам характар мыслення і таму лягчэй чытаецца. Для першага знаёмства з матэрыялам выкладчык можа параіць вучэбныя дапаможнікі або падручнікі для вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў.

Пераадоленне цяжкасцей, звязаных з абстрактным характарам матэматыкі, дасягаецца з дапамогай пастаяннага прыцягнення на практычных занятках канкрэтных матэматычных мадэлей, карацей кажучы, з дапамогай рашэння прыкладаў і задач. Няўменне рашаць прыклады сведчыць аб фармальным знаёмстве з матэрыялам, што перашкаджае і разуменню нашай навукі, і выкарыстанню яе вынікаў. Калі ў студэнта сустрэліся цяжкасці пры засваенні той ці іншай тэмы, то мэтазгодна звярнуцца да адпаведных прыкладаў, пачынаючы з самых простых, дазваляючых адчуць сваю сілу і ствараючых прадпасылкі для пераходу да больш складаных. Акрамя таго, да паслуг кожнага студэнта і дапамога таварышаў, і кансультацыя выкладчыка. Лекцыйныя і практычныя заняткі па матэматыцы цесна звязаны паміж сабой, што дазваляе студэнту зразумець тэорыю і набыць тэхнічныя навыкі.

Варта сказаць, што галоўная мэта практычных заняткаў—сумесная прапрацоўка матэрыялу, таму на такіх занятках выкладчыкі, як правіла, заахвочваюць узаемныя «падказванні» студэнтаў, сочачы за тым, каб студэнты падтрымлівалі належны такт у адносінах паміж сабой. У некаторых выпадках мы «пераключаем» найбольш моцных студэнтаў на індывідуальныя дадатковыя задачы або даручаем ім тут жа на занятках (час дарагі для ўсіх) апякаць іх таварышаў.

Пераканацца ў глыбокай змястоўнасці матэматыкі дазваляе любы фізічны курс. У кожным такім курсе раскрываюцца магчымасці розных матэматычных паняццяў. Канешне, гэта магчыма толькі тады, калі курсы на факультэце ўзгоднены па матэматычнай лініі адзін з другім. Пасля доўгіх метадычных пошукаў кафедра матэматыкі змагла ўлічыць тыя паняцці і вынікі матэматыкі, якія асабліва шырока выкарыстоўваюцца на факультэце ў спецыяльных курсах прафіліруючых кафедр. У сувязі з гэтым цяпер намячаецца некаторая пераакцэнтоўка ў матэматычных курсах на фізфаку, звязаная з выкарыстаннем раду новых паняццяў. Варта, аднак, падкрэсліць, што галоўным было і застаецца навучанне фізікаў фундаментальным раздзелам матэматыкі.

**Ю. БАГДАНАЎ,**
**загадчык кафедры матэматыкі фізфака, прафесар.**

# УСЕСАЮЗНАЯ ВАХТА КАМСАМОЛІІ

Трэці Усесаюзны камсамольскі сход — гэта старт моладзі да новых спраў у пяцігодцы. Асаблівасць яго ў тым, што канкрэтныя дзелавыя задачы ў выкананні рашэнняў XXIV з'езда КПСС будуць пастаўлены кожнай арганізацыі.

Сакратар камітэта камсамола універсітэта В. І. Пракошын расказвае, што Усесаюзны камсамольскі сход студэнтаў праходзіць у пярвічных арганізацыях курсаў і факультэтаў.

На павестцы дня — даклады па матэрыялах з'езда. Будуць заслуханы справаздачы сакратароў пярвічных арганізацый аб правядзенні Ленінскага заліку.

Асноўнай задачай студэнцкай камсамоліі застаецца паспяховая здача летняй экзаменацыйнай сесіі і падрыхтоўка да летняга працоўнага семестра.

**М. ІНІН.**

# ЗАДАЧЫ ВЫЗНАЧАНЫ

**Вывучэнню і прапагандзе матэрыялаў і рашэнняў XXIV з'езда КПСС у групах і на курсах былі прысвечаны чарговыя занятні семінара куратараў БДУ.**

**Аб задачах куратара гаварыў член парткома універсітэта дацэнт С. А. Малевіч. Даклад на тэму «XXIV з'езд КПСС і пытанні камуністычнага выхавання моладзі прачытаў доктар гістарычных навук прафесар А. Я. Жураў.**

**А. ШАБАД.**

# КУРАТАР ГРУПЫ

## КЛОПАТ, ПОШУК, ІНІЦЫЯТЫВА

Усе добрыя якасці, якімі павінен валодаць выкладчык, абавязкова патрабуюць памнажэння ў асобе куратара. Гэты ж чалавек ужо з першых дзён знаходжання студэнта ва універсітэце становіцца для яго не толькі настаўнікам, але і ўзорным прыкладам, памочнікам і вельмі часта сапраўдным сябрам. Таму не дзіўна, што сярод куратараў у групах першакурснікаў шмат найбольш вопытных выкладчыкаў, хоць не выключана, калі студэнцкая група знаходзіць добрага кіраўніка ў асобе аспіранта і ўжо не ўяўляе сабе лепшага куратара. Ёсць такія выпадкі і на філалагічным факультэце. Так, у час сельскагаспадарчых работ студэнты пазнаёміліся з былым настаўнікам, а цяпер аспірантам кафедры савецкай літаратуры Ю. В. Паталковым, а калі вярнуліся ва універсітэт, то папрасілі зрабіць яго куратарам сваёй групы.

Добра адклікаюцца аб сваім куратару аспіранту У. А. Наумовічу студэнты II групы II курса беларускага аддзялення. Вопыт камсамольскай работы дапамагае У. А. Наумовічу правільна і мэтанакіравана напраўляць жыццё групы. Ён устанавіў цесны кантакт з камсамольскімі арганізацыямі прадпрыемстваў і устаноў, дзе працуюць студэнты, наладжвае туды экскурсіі, каб лепей пазнаёміцца з умовамі працы, наведвае студэнтаў дома.

Разам з актывам групы куратар арганізаваў гутарку па матэрыялах III пленума ЦК ЛКСМБ. Перад студэнтамі выступіў загадчык студэнцкага аддзела ЦК ЛКСМБ Іван Грамыка. У гэтым семестры ў групе абмеркаваны матэрыялы XXIV з'езда КПСС, студэнты прыступілі да іх вывучэння. Адбылася цікавая сустрэча з беларускім кампазітарам Лучанком, экскурсія і вельмі прыемнае і карыснае знаёмства з калектывам харэаграфічнага вучылішча.

Аднак большасць сярод куратараў філалагічнага факультэта, асабліва на малодшых курсах — выкладчыкі з вялікім вопытам. Так, з васьмі куратараў першага курса (стацыянара) толькі адзін аспірант. Добра ведае куратарскую работу і мэтанакіравана працуе з групай першакурснікаў дацэнт кафедры зарубежнай літаратуры В. М. Цімафеева. Яна патрабавальна ставіцца да студэнтаў, правярае, як яны наведваюць заняткі, сходы. І ў той жа час шмат увагі ўдзяляе арганізацыі іх самастойнай работы. У групе праведзена гутарка аб тым, як самастойна працаваць з літаратурай. У полі зроку куратара знаходзяцца тыя, каму патрэбна індывідуальная дапамога. Вялікае значэнне тут надаецца палітінфармацыям, на якіх, акрамя рэкамендаваных, разглядаюцца актуальныя пытанні жыцця асобных краін.

У тым, што дружнай лічаць на філфаку другую групу, немалая заслуга куратара С. П. Прохаравай. Эрудзіраваны выкладчык, С. П. Прохарава добра ведае музыку, і гэтыя веды і любоў да яе імкнецца перадаць сваім выхаванцам. Гутаркі на палітычныя тэмы тут часта дапаўняюцца аглядамі літаратурных газет і часопісаў. Нярэдкія калектыўныя паходы ў кіно, на канцэрты, экскурсіі па славутых месцах сталіцы рэспублікі. Студэнты адзначаюць тактоўнасць свайго куратара, уменне абмеркаваць і высветліць, здавалася б, самыя складаныя пытанні, клопат аб уладкаванні студэнтаў на прыватных кватэрах.

Дзесяты год працуе куратарам ст. выкладчык кафедры беларускай мовы Н. Д. Міхей. Ён заўсёды імкнецца як мага лепей ведаць сваіх студэнтаў. І таму куратар прысутнічае на экзаменах, правярае канспекты лекцый і семінарскіх заняткаў, цікавіцца навуковай работай студэнтаў і прыцягвае іх у навуковыя гурткі.

Пастаянна ў курсе вучэбных спраў у сваіх групах куратары першага курса вячэрняга аддзялення. Яны ведаюць, хто са студэнтаў мае запазычанасць, стараюцца дапамагчы яе ліквідаваць. Л. Р. Машчэнская, напрыклад, вядзе «Журнал куратара».

У пачатку навучальнага года куратары правялі са студэнтамі гутаркі аб універсітэце, яго вучэбнай базе, аб мэтах і задачах вучобы.

Некаторыя студэнты прыцягваюцца да грамадскага жыцця факультэта. Студэнт Мягкоў з'яўляецца членам літаратурнага аб'яднання «Узлёт», супрацоўнічае ў факультэцкай насценнай газеце.

У групах, дзе куратарамі Н. С. Мажэйка і Л. А. Царанкоў, часта арганізоўваюцца цікавыя сустрэчы і вечары.

Ёсць карысны вопыт і ў куратараў другіх курсаў. Многія з іх рэгулярна наведваюць інтэрнат, арганізуюць цікавыя гутаркі, запрашаюць на студэнцкія вечары ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, герояў працы, робяць шэфскія выезды. У II групе II курса (куратар С. Н. Новікава) выдаецца літаратурны часопіс, збіраецца матэрыял для альбома «50 год БДУ». Пад кіраўніцтвам куратара выйшла два нумары насценгазеты «Пошук».

Высокай адзнакі заслугоўвае работа куратара III групы II курса рускага аддзялення Л. Л. Кароткай. Тут рэгулярна абмяркоўваецца паспяховасць, адзін са сходаў спецыяльна быў прысвечан наведанню заняткаў і грамадскай рабоце. Шмат цікавага і карыснага ўтрымлівае план работы куратара на бягучы семестр.

У IV групе гэтага ж курса куратар Д. В. Фёдараў пастаянна кантралюе самастойную працу студэнтаў, часта наведвае інтэрнат. Адзін раз у месяц ён праводзіць гутарку «Новае на кніжнай паліцы». Разам з актывам куратар арганізаваў наведанне выстаўкі фінскай графікі і жывапісу. Усім калектывам паглядзелі спектакль «Спячая прыгажуня» ў тэатры оперы і балета. У групе актыўна працуе агітбрыгада.

Вялікая і разнастайная работа праводзіцца куратарамі чацвёртага курса Я. М. Еўдакімавым, І. І. Лушчыцкай, І. А. Карабань, І. К. Германовіч.

У групе ст. выкладчыка нямецкай мовы Я. М. Еўдакімава абсалютная большасць студэнтаў выконвае канкрэтныя грамадскія даручэнні. Тут сістэматычна праводзяцца палітінфармацыі. Цікава прайшоў дыспут «Аб культуры паводзін». Створана агітбрыгада з 12 чалавек, якая выязджала ў сельскія школы. Штогод у поўным саставе група ўдзельнічае ў сельскагаспадарчых работах і вяртаецца ва універсітэт з пахвальнымі граматамі за добрасумленную працу.

Я. М. Еўдакімаў перапісваецца з бацькамі сваіх выхаванцаў, інфармуе аб вучобе і паводзінах іх дзяцей. Сістэматычна куратар наведвае інтэрнат, экзамены ў час сесіі.

Аднак больш уважлівае знаёмства з работай куратараў чацвёртага курса дазваляе выявіць і некаторыя недахопы. Так, большасць планаў работы схематычная, не адлюстроўвае спецыфічных асаблівасцей акадэмічных груп; паспяховасць многіх студэнтаў застаецца нізкай. Некаторыя з'яўляюцца хвасцістамі з першага курса (Доўбня і Бельская з І групы беларускага аддзялення, Корзун — з ІІ). Студэнты некаторых груп мала чытаюць. Так, напрыклад, у І групе рускага аддзялення бібліятэкай карыстаюцца толькі два чалавекі.

Куратары тт. Муталімава, Мяцельская, Яфімава, Мурына рэдка бываюць у інтэрнатах. Па-за ўвагай застаюцца жыццё і быт студэнтаў, якія пасяліліся на прыватных кватэрах.

Зусім недастаткова партбюро і дэканат, а таксама куратары груп выкарыстоўваюць у выхаваўчых мэтах педагагічную практыку студэнтаў.

Вопыт лепшых настаўнікаў моладзі гаворыць аб шматгранным і дабратворным уплыве старэйшых таварышаў, выкладчыкаў на студэнцкае асяроддзе. І таму лепшыя ўзоры куратарскай працы заўсёды павінны быць у цэнтры ўвагі партыйных бюро факультэтаў і вельмі актыўна прапагандавацца і распаўсюджвацца.

**РЭЙДАВАЯ БРЫГАДА:**
**І. СЯМЫКІН,** дацэнт кафедры навуковага камунізма.
**М. КОРЗУН,** выкладчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.
**А. ЛЕБЕДЗЕЎ,** аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.
**С. ЗАЙКО,** загадчык лабараторыі геабіяхіміі глебы.

*У парткоме абмеркавана пытанне аб тым, як партыйнае бюро філалагічнага факультэта кіруе работай куратараў. Адзначана лепшае з практыкі работы куратараў і выказаны заўвагі.*

*У пастанове партыйнаму бюро прапанавана абагульніць вопыт лепшых куратараў, шырэй прыцягваць да правядзення выхаваўчай работы сярод студэнцкай моладзі вядучых выкладчыкаў факультэта.*

*Прызнана нямэтазгодным зацвярджаць куратарамі груп аспірантаў, лабарантаў і пачынаючых выкладчыкаў.*

# 9 мая — Дзень Перамогі

## ВЕЧНА ЖЫВАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

Больш чвэрці века назад замоўк апошні залп Вялікай Айчыннай вайны. Прайшлі гады, але не згасла слава доблесных савецкіх воінаў. Іх подзвіг, бяспрыкладныя мужнасць і гераізм свята захоўваюць удзячныя нашчадкі.

Напярэдадні Дня Перамогі над фашысцкай Германіяй ваенная кафедра універсітэта праводзіць «Тыдзень сустрэч з подзвігам і героямі». Студэнты розных факультэтаў слухаюць расказы былых франтавікоў.

Перад маладзёжнай аўдыторыяй выступілі П. І. Чаранкоў, генералы ў адстаўцы А. В. Кірсанаў і Т. А. Трэбко. Беззапаветную адвагу баявых сяброў успамінае Герой Савецкага Саюза Н. Я. Зайцаў.

У Рэспубліканскім доме ДТСААФ у дні перадсвяточнага тыдня дэманструюцца кінафільмы ваеннай тэматыкі.

На факультэтах арганізуюцца калектыўныя паездкі ў Хатынь. У гонар Дня Перамогі ідуць спаборніцтвы на першынство факультэтаў па кулявой стральбе і іншых відах спорту.

НАШ КАР.

## ГОСЦІ—ВЕТЭРАНЫ

**Шчырымі апладысментамі сустрэлі студэнты геаграфічнага факультэта былога камандзіра Палескага падпольнага абкома партыі, аўтара кнігі «Браты па зброі» І. Дз. Вятрова. Разам з ім прыйшлі ўдзельнікі партызанскага руху на Палессі Р. С. Ляндацкі, С. В. Змушко. Гаворка ідзе пра нялёгкае партызанскае жыццё, пра здзекі фашыстаў над жыхарамі Палесся і пра помсту беларусаў за сваю родную зямлю.**

**Уважліва слухаюць ветэранаў юнакі і дзяўчаты. Як наказ, гучаць словы І. Дз. Вятрова, што шчасце моладзі заваявана кроўю старэйшага пакалення. І няхай яна ніколі не забывае пра гэта.**

**А. ЛАМЕКА.**

## ПОДЗВІГАМ НЕ ЗГАСНУЦЬ

**Аб мужнасці і гераізме савецкіх воінаў і партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны расказваюць нямала дакументальных і мастацкіх кніг. Яшчэ больш яскрава і глыбока ўсвядоміць сутнасць бессмяротнага подзвігу нашага народа ў тыя векапомныя дні, яго беззапаветную адданасць Радзіме дапамагае калектыўнае абмеркаванне гэтых кніг — дыспуты, канферэнцыі, сустрэчы з іх аўтарамі і героямі. Правядзенне такіх мерапрыемстваў ва універсітэце стала традыцыйным, а напярэдадні свята Перамогі асабліва частым. Вось і нядаўна супрацоўнікамі бібліятэкі А. М. Рукшыным, Л. К. Пясткоўскай і А. Т. Марозавай былі арганізаваны студэнцкія дыспуты па кнігах А. Ганчара «Чалавек і зброя», А. Бяляева «У зводках не паведамлялася», Е. Вараб'ёва «Незабудка», Эм. Казакевіча «Сэрца сябра» і іншых. Гасцямі моладзі былі непасрэдныя ўдзельнікі Айчыннай вайны выкладчыкі І. В. Марчанка, В. К. Кірылаў, М. М. Панчанка, М. В. Субоцін, І. М. Шчарбіна, якія раскрылі нямала цікавых старонак са сваіх ваенных гадоў.**

## БАЕЦ, ПЕДАГОГ, ВУЧОНЫ

**У жыцці дэкана факультэта журналістыкі нашага універсітэта дацэнта Р. В. Булацкага шчасліва супадаюць дзве даты — Дзень друку і дзень нараджэння. Сёння Рыгору Васільевічу — 50 год.**

**Гэта чалавек багатай біяграфіі. У гады Айчыннай вайны ён — бясстрашны лётчык савецкай штурмавой авіяцыі; цяпер — педагог, вучоны, аўтар многіх манаграфій і артыкулаў па праблемах партыйна-савецкага друку. Нядаўна на аб'яднаным пасяджэнні кафедр гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку была абмеркавана і рэкамендавана да абароны доктарская дысертацыя Рыгора Васільевіча «Ленін і ленінская школа публіцыстыкі».**

**Выкладчыкі, студэнцкі калектыў факультэта журналістыкі горача віншуюць юбіляра, жадаюць яму плённых творчых поспехаў на ніве навуковай і педагагічнай дзейнасці.**

### ШТУРМАН ЭКІПАЖА ДРУЖНЫХ

Далёка ад Масквы, на адным з ваенных аэрадромаў, служылі ў гады Вялікай Айчыннай вайны тры таварышы: лётчык лейтэнант Васіль Ульянаў, штурман малодшы лейтэнант Рыгор Булацкі і тэхнік-лейтэнант Васіль Школін. Аднойчы вечарам Рыгор Булацкі са сваімі неразлучнымі сябрамі сядзеў у цесным пакойчыку. Размова была адна — аб вайне, аб Сталінградскай бітве. Кожны з трох сяброў думаў над пытаннем: чым бы дапамагчы нашым байцам?

У гэты час паштальён прынёс газету. На першай старонцы буйнымі літарамі было надрукавана: «Патрыёт Ферапонт Галаваты набыў самалёт».

Сябры пераглянуліся. Ва ўсіх мільганула адна і тая ж думка. У іх жа ёсць нейкія зберажэнні. Яны аддадуць іх для ўмацавання Савецкай Арміі. Так і паступілі. А праз некалькі дзён сяброў выклікалі да камандзіра палка. Са штаба яны вярталіся радасныя і шчаслівыя. Збылося іх жаданне. Ім дазволена тэрмінова выехаць на фронт. І хутка яны атрымалі самалёт з надпісам: «Набыты на зберажэнні малодшага лейтэнанта Булацкага, лейтэнанта Ульянава і тэхніка-лейтэнанта Школіна».

Старанна рыхтаваліся сябры да першага баявога вылету. Цэль — чыгуначны вузел. На ім скапіліся варожыя эшалоны.

Самалёт — у паветры. Пры падыходзе да станцыі зенітныя гарматы фашыстаў адкрылі агонь. Па-майстэрску манеўруючы, Васіль Ульянаў вёў самалёт да цэлі. Праз некалькі імгненняў бомбы імкліва панесліся ўніз. Загарэліся вагоны са зброяй і боепрыпасамі, узрываліся чыгуначныя цыстэрны з палівам. Заданне было выканана выдатна.

Горача віншавалі таварышы экіпаж патрыётаў з першым баявым вылетам. Так пачалося франтавое жыццё сяброў. Ім даручаліся самыя розныя заданні, і яны заўсёды выконвалі іх паспяхова.

Аднойчы пасля ўдачнага бомбакідання на самалёт напалі два знішчальнікі праціўніка. Стралок-радыст мужна адбіваў атакі знішчальнікаў, а лётчык Ульянаў дапамагаў яму сваім высокім майстэрствам манеўравання. У адну з атак знішчальнікам удалося пашкодзіць левы матор. Але трапны агонь стралка-радыста прымусіў адысці самалёты ворага.

Вярталіся на свой аэрадром са зніжэннем. Хутка набліжалася зямля. Вось ужо бамбардзіроўшчык праімчаўся над галовамі гітлераўцаў і, не выпускаючы шасі, сеў на нейтральнай тэрыторыі...

Нешта моцна стукнула Рыгора Булацкага ў спіну. Ён страціў прытомнасць. Ачнуўся ўжо ў шпіталі. Раненне надоўга прыкавала яго да пасцелі. Марудна цягнуліся дні выздараўлення.

Раннім вясеннім днём Рыгор Булацкі вярнуўся ў свой полк. Экіпаж патрыётаў зноў граміў ворага. За паспяховае выкананне заданняў камандавання Рыгор Булацкі быў узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі. У Дзень Перамогі сябры зрабілі апошні баявы вылет на знішчэнне фашысцкай групіроўкі.

Наступілі дні мірнай вучобы. Лётчыкі працягвалі палёты. Час ляцеў непрыкметна. Але ўсё часцей і часцей давала сябе адчуць раненне, атрыманае Булацкім у гады Вялікай Айчыннай вайны. Хутка ўрачы забаранілі яму лятаць. З цяжкім пачуццём развітваўся Рыгор з таварышамі. Ён разумеў, што лятаць яму больш не давядзецца. Цяпер перад ім было новае жыццё.

На аэрадроме ў перапынку паміж палётамі камандзір перад строем эскадрыллі падзякаваў Булацкаму за добрую службу. Цёпла праводзілі авіятары свайго таварыша дадому.

Прыехаўшы ў родны край, Рыгор вырашыў вучыцца ва універсітэце. Закончыўшы яго, штурман атрымаў дыплом выдатніка і паступіў у аспірантуру. Камуністы аказалі свайму таварышу вялікі гонар — Булацкага выбралі сакратаром партыйнага бюро. Яшчэ праз два гады Рыгор Булацкі паспяхова закончыў аспірантуру. Ён настойліва працаваў над сваёй дысертацыяй і абараніў яе.

Так былы штурман стаў кандыдатам навук. Хутка маладога вучонага назначылі намеснікам дэкана факультэта. Цяпер свае веды Рыгор Васільевіч Булацкі перадае студэнтам. У навуковай рабоце і педагагічнай дзейнасці авіятар знайшоў сваё другое прызванне. І калі перад ім узнікаюць цяжкасці, ён паспяхова іх пераадольвае. У гэтым яму аказвае вялікую дапамогу служба ў ваеннай авіяцыі, армейская загартоўка.

**Капітан М. ЯГОРАЎ.**
**(«Савецкая авіяцыя», 26 студзеня 1958 г.).**

## ПАМЯТАЕМ ЗАЎСЁДЫ



У гераічны летапіс барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў нямала слаўных старонак упісалі мінчане. Складаны, поўны драматызму шлях прайшлі падпольшчыкі горада, цаною цяжкіх ахвяр набывалі баявы вопыт, удасканальвалі формы і метады арганізацыі і правядзення баявых аперацый. Пачаўшы летам 1941 года з распаўсюджання рукапісных лістовак аб падзеях на франтах Вялікай Айчыннай вайны, падпольшчыкі пазней праводзілі буйныя дыверсіі на важных для акупантаў ваенна-гаспадарчых аб'ектах, знішчалі відных гітлераўскіх чыноўнікаў, стваралі невыносныя ўмовы для ворага.

Сілы падполля змагаліся ў цеснейшай сувязі з партызанскімі фарміраваннямі, якія дзейнічалі вакол горада, аказвалі ім усемагчымую дапамогу і выконвалі ў горадзе важнейшыя разведвальныя і дыверсійныя заданні.

На чале гэтай бяспрыкладнай па мужнасці і гераізму барацьбы з лютым, узброеным да зубоў ворагам сталі камуністы. Яны прыцягвалі да барацьбы перадавую частку насельніцтва горада, згуртаваўшы яе вакол падпольнага камітэта КП(б)Б. Сярод удзельнікаў камуністычнага падполля важнае месца займалі прадстаўнікі савецкай інтэлігенцыі — медыкі, вучоныя, выкладчыкі школ і вну, савецка-партыйны актыў. Не ўсе з удзельнікаў дажылі да светлага майскага Дня Перамогі. Многія злажылі галовы ў барацьбе за гонар, свабоду і незалежнасць нашай вялікай Радзімы.

Не дажыў усяго чатыры дні да вызвалення Мінска і Яўген Міхайлавіч Зубковіч, кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры параўнальнай анатоміі БДУ.

Скупа выглядаюць дакументальныя звесткі аб гэтым вялікім патрыёце. Рэдка ён адкрываўся і неахвотна дзяліўся сваімі справамі ў падполлі, а вельмі блізкія сябры, якія працавалі разам з ім, загінулі. Таму цяжка амаль праз тры дзесяцігоддзі аднавіць поўную карціну подзвігу Я. М. Зубковіча.

Амаль тры гады падпольнай барацьбы... Выпадак не часты. Што ж дазволіла Я. М. Зубковічу паспяхова выконваць заданні падпольнай партарганізацыі горада, камандавання брыгады «Дзядзі Колі», спецатрада «Артур»?

Яшчэ да вайны, калі ў Германіі захапілі ўладу фашысты і там стала шырока распаўсюджвацца «расавая» тэорыя, Я. М. Зубковіч распрацаваў цыкл лекцый пад агульнай назвай «Чалавечыя расы і расавыя тэорыі». Лекцыі чыталіся не толькі перад студэнцкай аўдыторыяй, але і на прадпрыемствах горада, у гарадскім лекторыі. Падрыхтоўка гэтага цыклу патрабавала вывучэння вялікага матэрыялу і дала магчымасць аўтару глыбока прааналізаваць і паказаць самую сутнасць чалавеканенавісніцкай ідэалогіі фашызму.

Выключная вытрымка, уменне маўчаць, веданне правіл канспірацыі, глыбокая вера ў непазбежнасць краху трэцяга рэйха дапамагалі Я. М. Зубковічу паспяхова працаваць у падполлі. Умудроны вялікім жыццёвым вопытам (нарадзіўся Яўген Міхайлавіч у 1887 годзе ў в. Камень Барысаўскага ўезда Мінскай губерні), прайшоўшы праз гарніла першай сусветнай вайны, прысвяціўшы сваё жыццё выхаванню маладога пакалення (20 год ён працаваў у БДУ), вучоны-біёлаг разумеў, што з акупантамі трэба змагацца і змагацца насмерць.

Мінск быў у агні. Фашысты грабілі універсітэт. Я. М. Зубковіч разам з асістэнтам кафедры пазванковых А. В. Бязовічам, аспіранткай З. І. Завістовіч і іншымі супрацоўнікамі ратоўвалі заалагічны музей універсітэта, бібліятэку, архіў. Частка экспанатаў была перавезена ў непрыстасаванае памяшканне на Віцебскай вуліцы, а Яўген Міхайлавіч стаў вартаўніком астаткаў музея.

У кастрычніку 1941 года Я. М. Зубковіч устанаўлівае кантакты з мінскім падполлем. Маючы шырокія сувязі сярод медыкаў (у 20-х гадах ён працаваў на медыцынскім факультэце БДУ) і сярод вучоных Мінска, ён сістэматычна сустракаўся з доктарам С. Прылуцкім, Н. І. Барковай, прафесарам М. М. Нікольскім, З. І. Завістовіч, А. В. Вязовічам і іншымі. Шматгадовая дружба звязвала Я. М. Зубковіча з вядомым прафесарам Е. В. Клумавым, актыўным удзельнікам мінскага падполля.

Жыў Я. М. Зубковіч па вуліцы Энгельса, д. № 1, кв. 4, разам са сваімі сёстрамі Аляксандрай і Наталляй. Але сёстры не ведалі аб падпольнай дзейнасці брата. Часта яго, пакрытага сівізной старога, з вялікай акладзістай барадой, можна было сустрэць на вуліцах горада, нетаропка праязджаючым на веласіпедзе. Кожны тыдзень ён бываў у Е. В. Клумава, перадаваў яму звесткі аб становішчы на франтах вайны, забіраў падрыхтаваныя медыкаменты, перавязачны матэрыял для партызан. Нават аперацыя сястры Я. М. Зубковіча, якую асабіста рабіў Е. В. Клумаў, выкарыстоўвалася старымі сябрамі для сустрэч, як зручнае прыкрыццё.

Многа зрабіў Я. М. Зубковіч для выратавання мінчан і адпраўкі іх у партызанскія атрады. Было гэта зроблена на першы погляд вельмі проста. Прафесару М. М. Нікольскаму стала вядома, што можна адправіць людзей у лес. Блізка знаёмыя яму навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі прыходзілі да прафесара па кнігу з яго асабістай бібліятэкі. Атрымаўшы кнігу, на якой было напісана «З кніг М. М. Нікольскага», яны адпраўляліся да З. Завістовіч. Апошняя, атрымаўшы кнігу, накіроўвала таварыша да Я. М. Зубковіча, а той па ланцужку сувязных — у лес. Так пайшоў 12 чэрвеня 1943 года ў атрад «Знамя» брыгады «Разгром» выкладчык Н. Г. Матусевіч, так пайшлі дзесяткі іншых патрыётаў.

Нам вядома, што Я. М. Зубковіч распаўсюджваў антыфашысцкую літаратуру. Адпраўляючы ў партызанскія атрады мінчан, забяспечваў партызан медыкаментамі, збіраў у горадзе разведвальныя даныя. У 1943 — 1944 гадах ён быў сувязным партызанскай брыгады «Дзядзі Колі» і спецатрада «Артур».

Летам 1943 года ў Беларускі штаб партызанскага руху па партызанскіх каналах сувязі паступіў рукапіс Я. М. Зубковіча «Успаміны і думкі з выпадку «вызвалення». У ёй Яўген Міхайлавіч даў падрабязны аналіз акупацыйнага рэжыму ў Мінску, метадаў устанаўлення фашыстамі так званага «новага парадку», раскрыў на канкрэтных прыкладах злачынствы акупантаў у Мінску ў адносінах да мірнага насельніцтва, указаў, што прычыны такіх паводзін закладзены ў звярынай ідэалогіі фашызму.

У заключэнне ён пісаў: «Гэтыя факты трэба... памятаць заўсёды, каб правільна ацаніць тое «вызваленне», якое нам павінна была прынесці «новая Еўропа Адольфа Гітлера». Час расплаты за «вызваленне» ўжо блізка, і не дапамогуць цяпер фашысцкім разбойнікам ні стварэнне «вызваленчых армій», ні культыванне на крывавых правакацыях «адзіных франтоў» і, нарэшце, не апраўдаюць іх зверстваў ніякія хітрыкі».

26 чэрвеня 1944 года фашысты схапілі Я. М. Зубковіча, а праз тры дні расстралялі ў Трасцянцы.

Яўген Міхайлавіч Зубковіч уяўляў сабой прыклад сапраўднага патрыёта, многа зрабіўшага для партызанскага руху, які не задумваўся ахвяраваць сваё жыццё за Радзіму.

**В. ДАВЫДАВА,**
**кандыдат гістарычных навук.**

**На здымку: Я. М. Зубковіч** у 1943 г.

# ІДЭІ ЛЕНІНА Ў НАШЫХ СЭРЦАХ

Нядаўна замежныя студэнты і аспіранты, якія вучацца на асноўных факультэтах, падрыхтавалі тэматычны вечар «Ідэі Леніна ў маёй краіне». Даклад аб правадыру працоўных усяго свету зрабіў в'етнамскі студэнт II курса матфака Чан Дань Ван. Затым выступілі венгр Міхай Бенядзікт, француз Т'еры Далідон, балгарка Юліяна Хрыстава, в'етнамка Фам Тхі Тхе Льен, румын Мітакі Страт і аспірант з ГДР Ульрыке Энельман, якія расказалі аб ролі ленінскіх ідэй у жыцці іх народаў, іх краін, аб пераможным шэсці ідэй вялікага Леніна па планеце.

Да вечара студэнты і аспіранты падрыхтавалі вялікі канцэрт. Інтэрнацыянальны хор выканаў «Песню аб Леніне» С. Тулікава і «Песню аб Мінску» У. Алоўнікава. Верш Леаніда Вышаслаўскага «Невычэрпная крыніца» прачытаў Дам Ван Кім, а верш «Настаўнік працоўных» — Ву Той Хунг, студэнт II курса фізфака. Студэнты IV курса фізфака выканалі песні «Грэнада», «Эх, дарогі» і японскую песню «Усё для дваіх». «Песню пра Буравесніка» М. Горкага прадэкламаваў в'етнамскі студэнт Нгы. І раптам уварвалася мелодыя «Марсельезы», якую выконваў французскі студэнт Т'еры Далідон.

А вось гучыць руская «Рабінушка». Яе спяваюць Фам Конг Дзіен і Нгуен Тхі Да. В'етнамскі студэнт Май Ван Хіен прачытаў верш в'етнамскага паэта То Хыу «З Леніным».

У канцэрце прынялі ўдзел таксама Нгуен Ван Ан, Нгуен Шы Тхін, Чан Ван Чыонг.

Дапамаглі студэнтам падрыхтаваць цікавую праграму ст. выкладчыкі У. Г. Будай і М. С. Мяцельскі, выкладчыца Г. К. Бадрова.

С. ЮРКЕВІЧ,
М. КРЭСІК,
супрацоўніцы БДУ.



*Ідуць практычныя заняткі па арганічнай хіміі ў студэнтаў III курса хімфака. Дослед праводзяць В. Вашута і Г. Мішук.* *Фота Л. Калюжнай.*

## ХТО ВЫ, «АРГАНАЎТЫ»?

27—28 красавіка радыётэхнічны інстытут быў месцам правядзення II тура фестывалю эстрадных аркестраў вну Мінска. Першае месца заняў вакальна-інструментальны ансамбль БДУ «Арганаўты». Пра конкурс і пра сябе расказваюць удзельнікі ансамбля.

**Лёня Кладухін** (бас-гітара): Конкурс праводзіўся ў два туры. Першы — выяўленне пераможцы ўнутры вну. Умовы ўсегарадскога тура былі наступныя. Кожны ансамбль павінен быў прадставіць камсамольскую песню, беларускі твор, песню ўласнага сачынення і што-небудзь па выбару...

**Эдзік Петрашэвіч** (арган): Мы выканалі «Радзіму» Семянякі, песню нашага Валодзі Спірыдовіча «Безымянная магіла», на англійскай мове «Песню пратэсту» і «Аве-Марыя» Шуберта.

**Сяргей Молеў** (соль-гітара): У апошнім туры фестывалю ўдзельнічалі 7 творчых калектываў. Былі прадстаўнікі з інстытута замежных моў, інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі.

Першае месца — вялікая радасць і нечаканасць для «Арганаўтаў», яшчэ вельмі маладога калектыву. Цікава, што другое месца так нікому і не было прысуджана. Трэцяе падзялілі медыкі і палітэхнікі.

**Слава Ерэй** (ударныя): Нашаму ансамблю менш паўгода. Склаўся ён наступным чынам. Сабраліся неяк два-тры хлопцы, паспрабавалі арганізаваць нешта накшталт невялікай інструментальнай групы. Потым людзей прыбавілася. У апошні час мы вельмі часта выступаем разам з дзяўчатамі з Мінскага музыкальнага вучылішча. І яшчэ: усе мы займаемся на першым курсе фізфака, усе спяваем.

**Валодзя Спірыдовіч** (кіраўнік «Арганаўтаў», рытм-гітара): Чаму назва ансамбля менавіта «Арганаўты»? Вельмі проста. Мы ўвесь час у пошуках. Мы шукаем цікавыя і прыгожыя песні, імкнемся, каб ансамбль меў свой твар, каб выступленне кожнага з нас было характэрным і непаўторным.

В. ЯЦЭВІЧ.

# АГЛЯД ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Штогадовым стала правядзенне Усесаюзнага грамадскага агляду па культуры вытворчасці і ахове працы сярод вышэйшых навучальных устаноў. Наш універсітэт, які дабіўся лепшых паказчыкаў у конкурсе за 1970 год, прадстаўлен да ўзнагароды Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза.

З мэтай шырокага прыцягнення прафесарска-выкладчыцкага і вучэбна-дапаможнага саставу, інжынерна-тэхнічных работнікаў, рабочых і служачых універсітэта да распрацоўкі і правядзення мерапрыемстваў па павышэнню вытворчай культуры, паляпшэнню і аздараўленню ўмоў працы рэктарат і мясцком універсітэта пастанавілі:

1. Прадоўжыць у 1971 годзе грамадскі агляд па культуры вытворчасці і ахове працы ва універсітэце.

2. Устанавіць, што калектывы факультэтаў, кафедр, навукова-даследчых лабараторый, груп адміністрацыйнай і гаспадарчай часткі і іншых падраздзяленняў універсітэта, якія дабіліся лепшых паказчыкаў па выкананню ўмоў агляду, узнагароджваюцца:

а) факультэт, заняўшы першае месца, — дыпломам з прысваеннем звання «Факультэт высокай культуры вытворчасці і аховы працы»; факультэты, заняўшыя другое і трэцяе месцы, — Ганаровымі граматамі універсітэта;

б) кафедра, заняўшая першае месца, — Ганаровай граматай універсітэта з прысваеннем звання «Кафедра высокай культуры вытворчасці і аховы працы» і ўручэннем пераходнага вымпела. Агульнауніверсітэцкай кафедры, заняўшай першае месца, адпаведна прысвойваецца званне «Кафедра высокай культуры вытворчасці і аховы працы» і ўручаецца пераходны вымпел;

в) лабараторыя, група адміністрацыйна - гаспадарчай часткі або іншае падраздзяленне універсітэта, якое дабілася лепшых паказчыкаў,— Ганаровай граматай універсітэта з уручэннем пераходнага вымпела.

3. Устанавіць, што асобы, прыняўшыя найбольш актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні грамадскага агляду па культуры вытворчасці і ахове працы, узнагароджваюцца граматамі рэктарата, парткома і мясцкома універсітэта.

4. Абавязаць кіраўнікоў факультэтаў, кафедр і іншых падраздзяленняў распрацаваць дадатковыя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне культуры вытворчасці, бяспекі, аблягчэнне і аздараўленне ўмоў працы, паляпшэнне санітарна-бытавога абслугоўвання рабочых і служачых на рабочых месцах і ў цэлым на факультэце, кафедры або іншым падраздзяленні універсітэта і забяспечыць іх выкананне з шырокім прыцягненнем прафесарска-выкладчыцкага і вучэбна-дапаможнага саставу, інжынерна-тэхнічных работнікаў, рабочых і служачых універсітэта.

5. Для правядзення агульнауніверсітэцкага агляду па культуры вытворчасці і ахове працы і падвядзення яго вынікаў стварыць агульнауніверсітэцкую камісію ў саставе:

Старшыня камісіі —старшыня мясцкома В. Ф. ЧЫГІР, наменік старшыні камісіі— прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. МАЛЫШАЎ;

Л. В. ВАЛАДЗЬКО —прарэктар па навуковай рабоце;

І. А. АЖЫГІН—прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы;

І. А. ЛЯПЁШКІН —старшы інжынер па тэхніцы бяспекі;

І. В. ГАЛАВАТЫ — начальнік дазіметрычнай службы;

Ф. П. РЭЗНІКАВА—загадчыца аддзялення паліклінікі;

К. В. САБІЛА — старшыня камісіі па ахове працы і тэхніцы бяспекі мясцкома;

С. М. ГРАБЧЫКАЎ — член камісіі па ахове працы і тэхніцы бяспекі мясцкома;

М. Д. ЦІВА — наместнік сакратара парткома;

Д. М. САКОВІЧ — намеснік старшыні мясцкома;

М. М. ДРОЗД — старшыня прафкома БДУ.

Для кіраўніцтва аглядам на факультэтах і ў іншых падраздзяленнях БДУ стварыць камісіі.

Асноўнымі паказчыкамі для ацэнкі культуры вытворчасці і аховы працы з'яўляюцца:

— укараненне новай тэхнікі і тэхналогіі, значна паляпшаючай умовы працы, комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў, герметызацыі абсталявання, дасканалых сістэм блакіровак і агарожы небяспечных вузлоў і механізмаў;

— выкананне мерапрыемстваў, уключаных у пагадненне па ахове працы, а таксама распрацоўка мерапрыемстваў і прапаноў на будучае;

— рацыянальная арганізацыя рабочых месц, якая забяспечвае высокапрадукцыйныя, здаровыя і бяспечныя ўмовы працы. Забеспячэнне нармальнага стану паветранага асяроддзя і асвятлення, наяўнасць санітарна-бытавых памяшканняў, падтрыманне рабочых месц, карпусоў, памяшканняў лабараторый, кафедр і г. д. у адпаведнасці з правіламі тэхнікі бяспекі і санітарнымі нормамі;

— укараненне тэхнічнай эстэтыкі. Выкананне рэкамендацый па рацыянальнай цветавой аддзелцы займаемых памяшканняў і абсталявання;

— утрыманне і эксплуатацыя аб'ектаў павышанай небяспекі ў адпаведнасці з патрабаваннямі правіл тэхнікі бяспекі;

— здзяйсненне мерапрыемстваў па памяншэнні вытворчага шуму і вібрацыі да ўзроўню ніжэй прэдзельна дапусцімых норм;

— забеспячэнне супрацоўнікаў і студэнтаў спецадзеннем, спецабуткам, ахоўнымі сродкамі ў адпаведнасці з галіновымі нормамі;

— паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання, масавай фізкультурнай работы і павышэнне грамадскай актыўнасці супрацоўнікаў, студэнтаў, аздараўленне умоў іх працы;

— ліквідаванне вытворчага траўматызму;

— паляпшэнне навучання і нагляднай агітацыі па пытаннях бяспекі працы; арганізацыя стэндаў, куткоў, кабінетаў па тэхніцы бяспекі.

Вынікі агляду падвесці ў снежні 1971 года.

# НЯХАЙ КРАСУЕ ДРУЖБА

Несці ў масы моладзі слова партыі — традыцыя Ленінскага камсамола. Яна добра адчувалася на арганізаваным гаркомам камсамола трохдзённым семінары актыву замежных студэнтаў, якія займаюцца ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах Мінска.

У семінары ўдзельнічалі прадстаўнікі Балгарыі, ГДР, Францыі, Кубы, Алжыра, Іарданіі, Грэцыі, Афганістана, В'етнама, афрыканскіх краін.

Асноўнае месца ў праграме семінара было адведзена матэрыялам XXIV з'езда КПСС, актуальным праблемам сусветнага рэвалюцыйнага руху, ролі моладзі.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. Р. Круцько ў гутарцы з удзельнікамі семінара падкрэсліў, што нацыянальна-вызваленчая барацьба ў краінах Азіі і Афрыкі стала практычна перарастаць у барацьбу супраць эксплуататарскіх адносін.

Цікава праходзіла сустрэча з першым сакратаром Мінскага гарадскога камітэта камсамола В. М. Калпаковым.

Замежныя студэнты, прадстаўнікі маладзёжных калектываў прадпрыемстваў надалі вялікае значэнне выхаванню пачуццяў інтэрнацыяналізму, патрыятызму ў падрастаючага пакалення.

Удзельнікі былі рады сустрэчы з дэлегатамі форума камуністаў у Маскве А. Ф. Багданавым, У. М. Калачыкам і іншымі.

Выказваючы думку наконт арганізацыі падобных сустрэч моладзі, студэнт юрфака БДУ Самір Шахін піша ў распаўсюджанай анкеце: «Семінар мае асаблівае значэнне, таму што рашэнні з'езда з'яўляюцца важнымі не толькі для савецкіх людзей, але і для ўсіх, хто змагаецца за свабоду, незалежнасць, салідарнасць і дружбу народаў свету».

Вечар дружбы, які папярэднічаў падвядзенню вынікаў, праходзіў у самых цёплых, сяброўскіх абставінах. І калі хтосьці на сцэне запяваў песню, яму тут жа дапамагалі дзесяткі сяброў. Студэнты з Афрыкі чыталі вершы У. Маякоўскага, а прадстаўнікі краін Блізкага Усходу спявалі песні аб Расіі.

В. АЛЬКОВА.

Калектыў кафедры гісторыі філасофіі і логікі, дэканат, партбюро, прафбюро і ўвесь калектыў гістарычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку А. Г. Кляцкову з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Тыраж 2000 экз. Заказ 591. АТ 09218